**УДК 39(476-22)(091)**

**ЯГАДЫ Ў СІСТЭМЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ**

***А.В. Сумко***
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, Рэспубліка Беларусь

*Разглядаецца значэнне ягад у жыццезабеспячэнні беларускіх вяскоўцаў ва ўмовах складаных абставін пасляваеннай жыццядзейнасці. У якасці асноўных крыніц выступілі матэрыялы вуснай гісторыі, зафіксаваныя падчас палявых экспедыцый Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай ў 2000-х гадах на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, успаміны па-за межамі ўзгаданай тэрыторыі выступаюць у якасці дадатковай інфармацыі. Выкарыстаныя вуснагістарычныя крыніцы дазволілі зразумець спецыфіку абранай праблемы ў калектыўнай памяці вясковага насельніцтва Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *сістэма жыццезабеспячэння, жыццядзейнасць, збіральніцтва, беларуская вёска, вусная гісторыя.*

Палявыя матэрыялы сведчаць, што спажыванне і рэалізацыя ягад вясковым насельніцтвам у перыяд пасляваеннага аднаўлення займала важнае месца ў жыццезабеспячэнні. Спектр збіральніцтва і маштаб выкарыстання вызначаўся ўзроўнем дабрабыту сям'і, месцам распалажэння населеннага пункта (паблізу ці ўдалечыні ад леса / горада / буйнога мястэчка / чыгуначнай станцыі) і быў абумоўлены канкрэтнымі прыроднымі ўмовамі. Калі мясцовасць падыходзіла для збіральніцтва, то яе выкарыстоўвалі максімальна. Разам з тым, успаміны рэспандэнтаў сведчаць пра тое, што ва ўмовах непрыгоднага ландшафту, здабываючыя практыкі былі перыферыйным элементам жыццезабеспячэння сялянскай сям'і: "[Збіральнік, далей ЗБ.: У вас жа там было балота і лес… Ці хадзілі за ягадамі?]. Інфармант, далей Інф.: *Не. Лес быў дзе-та кіламетраў пяць. Хадзілі…, але ж мы – дзеці, баяліся. Калі мама, але рэдка, не было часу ей, беднай. Далёка, пяць кіламетраў туды і назад, і па балоце. Уже после пасушылі балота, тарфянік сталі дабываць, тады ўжо лягчэй было. Можна было ўжо і ў лес*" (Маладзечанскі р-н)[1].

Матэрыялы вуснай гісторыі, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра збіральніцтва ягад вясковым насельніцтвам у паваенны перыяд можна разбіць на дзве групы: ягады як харчовы рэсурс і як крыніца даходаў.

Ягады ў якасці харчовага рэсурса, былі вельмі запатрабаванымі ў разглядаемы перыяд. Палявыя матэрыялы фіксуюць, што ў першы год пасля вызвалення, асабліва для тых сямей, якія вярталіся з эвакуацыі ці нацыстскай няволі, ягады былі базавым прадуктам харчавання, які дазваляў пратрымацца да першага пасляваеннага ўраджаю: "[ЗБ.: Ну, а вот як дзеці, ці сабіралі, як галодна было грыбы, ягады, летам?] ІНФ.: *Ну, а як?! Толькі ж жылі з гэтага.*" (Расонскі р-н)[2]. Большасць рэспандэнтаў сведчаць, што збор ягад у паваенныя гады з большага ўваходзіў у кампетэнцыю дзяцей, бо дарослыя былі занятыя ці ў калгасе, ці ў сваёй гаспадарцы. "*ІНФ.: Маці ў мяне была толькі адна і ёй хватала хазяйства, ужо я, як падрасла, то я ўжо хадзіла ў ягады*" (Глыбоцкі р-н)[3].

Летам збіралі суніцы, чарніцы, маліны, па восені – брусніцы і журавіны. Асобна трэба адзначыць рэсурсны патэнцыял журавін. Гэтыя ягады можна было збіраць у розныя сезоны, а менавіта, як па восені, так і вясной. "*ІНФ.: …Вясной. З-пад зімы..Яна астаеццца харошая клюква*" (Расонскі р-н)[4]. Журавіны перазімаваныя на імху былі лепшыя, бо мелі больш клёку [1, с. 42]. Некаторыя рэспандэнты, асабліва са спаленых вёсак узгадвалі, што ў першыя гады пасля вызвалення ад нацыстаў былі вельмі ўраджайныя на маліну: "*ІНФ.: Маліну вось пасля вайны, можа што было пажжонае ўсё і пустувала, но маліны было проста наросшы мора*" (Верхнядзвінскі р-н)[5]. Ягады выкарыстоўвалі ў ежу адразу, а калі ў гаспадарцы была карова, то спажывалі разам з малаком: "*ІНФ.: Як была дзеўкай як няма што есці дык тады, карова была, малака, ягада чарніка, наберыш і паясі, а тады ў малако насыпеш і лыжкай гэтыя ягады чарнікі і з малаком*" (Браслаўскі р-н)[6]; "*Мы, малыя, бегалі, поўную даяначку наберым, прынясём і з малаком з'ядзем*"(Полацкі р-н)[7]. Рэспандэнты адзначалі, што адмысловае месца ў сістэме жыццезабеспячэння вясковай сям'і займала нарыхтоўка ягад на зіму, пераважна гэта былі брусніцы і журавіны, якія працяглы час не псаваліся і не патрабавалі спецыяльных дадатковых інгрэдыентаў. "*ІНФ.: У нас была брусніка, клюква была, чарніка. Бруснiку даже вадой залівалі і гнёт дзеравянны лажылі, і камням гнёт. І так бруснiку сахранялі.* [ЗБ.: А як кушалі?] *ІНФ.: Як прыходзілася: і з картошкаю елі, і з сахарынам гэтым, як хто дзе дабудзе.*" (Дзяржынскі р-н)[8]. Ягады, якія патрабавалі цукру для кансервацыі, на зіму амаль не нарыхтоўваліся, адразу спажываліся (некаторыя рэспандэнты ўзгадвалі пра тое, што сушылі, напрыклад, чарніцы, але, калі гаворка ішла пра складаны пасляваенны перыяд, то гэта было не распаўсюджана, прынамсі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Сушаныя ягады выкарыстоўвалі пераважна ў якасці лекавых сродкаў і для прыгатавання напояў.). Кансервацыя ягад з цукрам жыхарамі паваеннай вёскі пачала ажыццяўляцца значна пазней, калі сітуацыя з харчовым забеспячэннем стабілізавалася і ў вяскоўцаў з'явілася магчымасць набыць салодкае рэчава, а таксама перастала бракаваць посуду.

Пад час размовы пра ролю і месца ягад у сістэме жыццезабеспячэння, некаторыя рэспандэнты ўзгадвалі пра збор галубікі (буяк, гнаболі, дурніцы), асабліва ў Расонскім і Вярхнядзвінскім раёнах. Старажылы адзначалі, што гэтыя ягады не

---

[1] З мэтай захавання прыватнасці асабістых даных прыводзяцца толькі ініцыялы рэспандэнтаў і пазначаецца пол: Ж – жанчына, М – мужчына. Запісы захоўваюцца ў Цэнтры вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, а таксама ў асабістым архіве аўтара. Запісаў аўтар (ЗА) у 2021 г. ад Ж., 1938 г.н., в. Асавец Маладзечанскі р-н.

[2] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай (ФА ПДУ): Зап. у 2019 г. ад Ж. 1929 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.

[3] ФА ПДУ: Зап у 2018 г. ад Ж., 1940 г.н., в. Галубічы Глыбоцкага р-на.

[4] ЗА у 2019 ад Ж., 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-н.

[5] ЗА у 2020 г. ад Ж., 1933 г.н., в. Асвея Верхнядзвінскага р-на.

[6] ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Ж., 1927 г.н., в. Ёдлавічы Браслаўскага р-на.

[7] ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Ж., 1931 г.н., в. Мураўшчына Полацкага р-на.

[8] ЗА у 2022 г. ад Ж. 1938 г.н., в. Данілавічы Дзяржынскга р-на.

прадавалі і многа ня елі, акцынтуючы ўвагу на спецыфічныя акалічнасці, звязаныя з раслінай. Адным са спосабаў збору ягады было выкарыстанне табакі, калі круцілі самаробныя цыгарэты і спецыяльна дымілі, каб нетралізаваць уздзеянне багуна. Ва ўспамінах пра галубіку, рэспандэнты ўзгадваюць іншы раз анекдатычныя жыццёвыя гісторыі, у якіх адлюстроўваецца спецыфіка спажывання гэтай ягады: "*ІНФ.: Пецька ў гнаболі ўлез, ну і гаворыць: "Я буду, гэта самае, пан, а вы мне насіце даніну". Мы яму назбіраем ягад, а ён еў, еў і еў гэтыя ягады. А гнаболі ды ў імху і п'яны стаў, дамоў не прышоў. Прыходзім мы дамоў, гаворым ягонай матке: "Пецька астаўся ў лясу, таму что ён наеўся гнаболі, ён сказаў: "Я – пан, насіце мне даніну", мы яго накармілі." Вядзіце, паказывайце дзе!. Прывялі дамоў і палажылі ў канаплю, а канапля адцягівала ўсю п'янку і лечыла, палажылі, ён паляжаў да вечара, вечарам устаў і пашоў*" (Расонскі р-н)[1].

Для значнай колькасці вяскоўцаў ягады з'яўляліся не толькі харчовым рэсурсам, але і крыніцай даходаў: "*Набяром у кустах. Нас жа ў дзярэўні было многа малых. Дзярэўня была бальшая і нас было многа. Хадзілі ў лес.* ***Ягады елі і прадавалі***" (Верхнядзвінскі р-н)[2]. Пра камерцыйны аспект збіральніцтва ў паваенны час узгадваюць рэспандэнты, пераважна з населеных пунктаў, якія знаходзіліся ў адноснай даступнасці да чыгуначных станцый, горада, ці буйных мястэчак, насельніцтва якіх магло расплаціцца, бо атрымлівала заробак грашыма [3, с. 182]. Ягады прадавалі на базарах ці па дамоўленасці з пакупнікамі. Вельмі добра ягады рэалізоўваліся ў населенных пунктах, дзе непадалёку размяшчаліся ваенныя гарнізоны: "*ІНФ.: Я помню мы сабіралі клюкву, а тады ў Баравуху пяшком насілі, стаканам прадавалі. Вясной, з-пад зімы яна астаецца харошая клюква. Пакупалі людзі, там жа ваенныя афіцэравы жоны былі, куплялі. І вось клюкву прададзім, купім 2-3 скібкі хлеба і дамоў прыйдзем.*" (Расонскі р-н) [3]. Рэалізацыя ягад прыносіла невялікі прыбытак у сямейны бюджэт, які даваў неабходныя сродкі для набыцця базавых прадуктаў харчавання і тавараў першай неабходнасці: "*ІНФ.: Ягадзіну, бегалі, сабіралі – прадавалі. У Бешанковічы пяшком насілі*" (Бешанковіцкі р-н)[4]; "*Саберыш ягад якіх-небудзь і нясёш на плячах, вот так напрамкі, цераз лес. Тады прададзім на базары, купім хлеб і камсы якой-небудзь. Хадзілі і дарослыя, нада ж была і капеечка, нада ж было хлеб купіць. Раненька да работы пабягуць і саберуць, а потым у горад вырвуцца. А як жыць?!*" (Полацкі р-н)[5]; "*ІНФ.: У Смаляны хадзілі прадавалі па 10 капеек стаканчык – хто купіць, а хто не. Нас многа такіх было. Сабяромся табункам і пайшлі. Чарніцы бралі харашо і земляніку бралі харашо*" (Сенненскі р-н)[6]. Большасць рэспандэнтаў узгадвала, што грошы ад рэалізацы ягад аддавалі маці:" *ІНФ.: Мне было помню адзінаццаць гадоў, як мы ў дзяцінстве ягады: чарніцы, маліны сабіралі і насілі прадаваць у тое Варапаева на базар. Дзень збіраем, а на другі дзень нясём прадаваць за капейкі. А пад вечар наша мама ішла сюды ў Варапаева за гэтыя нашы капейкі ў вочараць за хлебам*" (Пастаўскі р-н)[7]. Паралельна з аднаўленнем гаспадаркі і стабілізацыяй сітуацыі з харчаваннем адбывалася пераразмяркаванне расходаў – дзіцячы заробак стаў накіроўвацца на падрыхтоўку да навучальнага года: "*ІНФ.: Мы ў клюкву хадзілі. Ягады прадавалі, здавалі. Наберыш клюквы, здасі і куплялі тетрадкі, кніжкі, ручкі. Самі сабе.*" (Міёрскі р-н)[8]; "[ЗБ.: Можа за ягадамі хадзілі ў лес?] *ІНФ.: Ягады – абязацельна*! *Мы самі малыя, ну зусім малыя…усіх на матушку, дзеці з усёй дзярэўні, пайшлі ў ягады.* [ЗБ.: А што значыць "на матушку"?] *ІНФ.: Ну як (смяецца - аўт) друг за дружкам, ну за сабой цянулі. Земляніку, чарніку, усё сабіралі, галубіку.* [ЗБ.: А што вы з тых ягад рабілі?] *ІНФ.: Маліну здавалі, нейкія капекі плацілі.* [ЗБ.: А куды здавалі? У магазін?] *ІНФ.: У прыёмны, возле леса быў пункт. Гэта за Курылавічамі мы хадзілі і капеечкі гэтыя – у школу ж нада было сабірацца*" (Міёрскі р-н)[9].

Калі спачатку ягады пераважна прадавалі на базарах ці па дамоўленасці з пакупнікамі, то пасля нааджвання функцыянавання нарыхтоўчых кантор, ягады пачалі здаваць туды, каб атрымаць дадатковыя грошы ці тавары. Гэта, у сваю чаргу, актуалізавала збіральніцтва і павысіла яго значэнне ў гаспадарчай дзейнасці вяскоўцаў, перш за ўсё для тых населенных пунктаў, якія з-за свайго месцараспалажэння не маглі атрымоўваць дадатковы прыбытак ад рэалізацыі на базары ў горадзе ці чыгуначнай станцыі. Неабходна адзначыць, што рэспандэнты, якія пражывалі на тэрыторыі заходніх раёнаў, узгадвалі, што актыўнае камерцыйнае збіральніцтва пачалося пасля таго, як былі арганізаваны нарыхтоўчыя пункты: "*ІНФ.: Гэта ўжо после сталі іх прынімаць. Ну капейку можа якую мне.. я ж ужо помню, хадзіла, мне можа гадоў было дзесяць.*[ЗБ.: А колькі збіралі?] *ІНФ.: Ну, сабіралі сколькі каму хто сколька можаць. Вядро хто насабіраець, ну. А як не было дык і эта ж капейка, ну. Тыя я ж капейкі, ну куды ў хату ж дамоў, куды прынасілі і нада ж было нешта купіць, надаж было нешта і надзець, надаж было нешта і абуць*" (Глыбоцкі р-н)[10]. "*ІНФ.: І клюкву, і брусніку сабіралі, і земляніку сабіралі, і чарніку сабіралі, і маліну сабіралі.* [ЗБ.: А што вы з ёй рабілі? Самі елі ці кудысці здавалі, прадавалі?] – *ІНФ.: Здавалі ў гасударства, прынімалі ўсе ягады, загатавіцелі былі так называемыя. Загатавіцелі прынімалі, ну і капейкі нейкія плацілі. Мы ўсё маме з татам атдавалі, дзеньгі*" (Міёрскі р-н)[11] Значны прыбытак прыносіла рэалізацыя журавін, што было камерцыйна прыбытковым. асабліва актуальным гэта было для насельніцтва раёнаў, якія знаходзіліся каля балот. "*У ягады ня толька мае, тут уся вёска хадзіла. Выйдзець цэлае стада – атрад па дзесяць, па дванаццаць чалавек, і болей. Збіралі, сколькі панясець. Журавіны. А тады і пад'ежджаем, бываець, калі, то на кані, то на ровэры, то як-небудзь падойдзеш, дзе ўжо, як выцягнуць яны з Моху. Вучылісі, на канікулы прыедуць – на Мох, ягады збіралі, прадавалі, нада ж была сабе грошы напакаваць на зіму*" (Шаркаўшчынскі р-н) [2, с. 332-333]; "*ІНФ.: У нас клюква там болей, як ужо даход быў, болей з клюквы*" (Міёрскі р-н)[12]; *"ІНФ.: Клюкву восенню, вёдрамі сабіралі і насілі, балоты бальшые, клюквы было многа"*(Полацкі р-н)[13].

[1] ЗА у 2019 г. ад Ж., 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.
[2] ЗА у 2020 г. ад Ж., 1936 г.н., у в. Асвея Верхнядзвінскага р-на.
[3] ЗА у 2019 ад Ж., 1935 г.н, в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
[4] ФА ПДУ: Зап. у 2014 г. ад Ж., 1927 г.н., в. Соржыца Бешанк. р-на.
[5] ЗА у 2020 ад Ж., 1939 г., в. Заазерье Полацкага р-на.
[6] ЗА у 2022 г. ад Ж., 1940 г.н., в. Рай Сенненскага р-на.
[7] ФА ПДУ: Зап. у 2014 г. ад Ж., 1943 г.н., в. Луцк-Казлоўскі Пастаўскага р-на.
[8] ЗА у 2020 г. ад Ж., 1940 г.н., в. Дворнае Сяло Міёрскага р-на.
[9] ФА ПДУ: Зап. у 2019 ад Ж., 1943 г.н., в. Цвеціна Міёрскага р-на
[10] ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Ж., 1940 г.н. у в. Калечполле Глыбоцкага р-на.
[11] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Ж., 1944 г.н., у г. Дзісна.
[12] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Ж., 1935 г.н., г. Дзісна Міёрскага р-на.
[13] ЗА у 2019 г. ад Ж., 1928 г.н., в. Махірова Полацкага р-на.

**Спіс выкарыстаных крыніц**
1. Беларусы : У 8 т. Т.1: Прамысловыя і рамесныя заняткі / Рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 351 с.
2. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – Ч.2. – 368 с.
3. Сумко, А. В. Збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки.– 2021. – № 1. – С. 178 - 184.

**BERRIES IN THE SUPPORT SYSTEM OF THE BELARUSIAN VILLAGE IN THE FIRST POST-WAR YEARS**

***A. Sumko***

*The importance of berries in the life support of Belarusian villagers in difficult living conditions is considered. The main source is oral history materials that were recorded during field expeditions of the Center for Oral History and Field Research of Polotsk State University in the 2000s on the territory of the Belarusian Podvinya, memories outside the mentioned territory act as additional information. The oral historical sources used made it possible to understand the specifics of the problem in the collective memory of the village population of Belarus.*

***Keywords:*** *life support system, vital activity, gathering, Belarusian village, oral history.*